Анісімава В.Р.,
выкладчык

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КУРСА "РАБОТА З ФАЛЬКЛОРНЫМ МАТЭРЫЯЛАМ"

Курс "Работа з фальклорным матэрыялам" быў уведзены замест курса "Чытанне харавых партытур". Гэта замена звязана з тым, што кафедра беларускай народнапесеннай творчасці ставіць сваёй задачай больш глыбокае вывучэнне беларускага фальклору.

Мэта курса "Работа з фальклорным матэрыялам" -- выхаванне ў студэнтаў практычных навыкаў самастойнай работы з песенным фальклорам, развіццё музычна-эстэтычнага густу.

Цесная ўзаемасвязь курса "Работа з фальклорным матэрыялам" з асноўнымі дысцыплінамі спецыялізацыі: дырыжыраваннем, харавой практыкай, аналізам музычных форм, методыкай запісаў і расшыфроўкі народных песень і інш. -- важнейшая ўмова эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу.

У працэсе вывучэння студэнты знаёмяцца з асаблівасцямі меладычнага і метрарытмічнага стылю, якія характарызуюць народную музычную культуру розных рэгіёнаў Беларусі.

Неабходна навучыць студэнтаў вызначаць спецыфіку інтанацый песеннага матэрыялу, ведаць, чым адрозніваюцца песні розных цыклаў: каляндарна-земляробчыя, сямейна-абрадавыя, лірычныя і іншыя.

У працэсе асваення курса "Работа з фальклорным матэрыялам" студэнты вучацца:

граматна і прафесійна разбірацца ў запісах песеннага фальклору;

традыцыйнаму выкананню народнай песні з адначасовай ігрой на фартэпіяна і тактыраваннем адной рукой;

аналізу народнай песні.

Таксама студэнт павінен вывучыць усе ўмоўныя абазначэнні, якія сустракаюцца пры запісах фальклорнага песеннага матэрыялу.

Аснову вучэбнага рэпертуару складаюць найбольш цікавыя ўзоры мнагапланавага песеннага народнага мастацтва.

У праграму курса ўключаны традыцыйныя тыповыя песні каляндарнага, сямейна-абрадавага цыклаў, старажытныя напевы балад, сямейна-бытавыя песні, неабрадавыя лірычныя песні, а таксама песні танцавальнага і частушачнага характару.

Курс "Работа з фальклорным матэрыялам" вывучаецца ў 5, 6, 7 семестрах.

На пачатку кожнага семестра складаюцца індывідуальныя планы з улікам праграмных патрабаванняў, агульнага ўзроўню музычнай падрыхтоўкі і індывідуальных здольнасцей студэнтаў.

Неабходна навучыць студэнта вызначаць у песні самае істотнае і перадаваць змест і характар песні пры яе выкананні на фартэпіяна і голасам.

У працэсе вывучэння ў асноўным выкарыстоўваюцца фальклорныя зборнікі, якія склалі З.Мажэйка і З.Эвальд.

Гаўрына Л.М.,
ст.выкладчык

## ХАРАКТЭРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ НАРОДНАЙ ПЕСНІ І ІХ ВЫКАРЫСТАННЕ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

Увесь комплекс спецыяльных дысцыплін у сістэме народна-харавой спецыялізацыі звязаны адзінствам творчага асэнсавання і практычнага асваення фальклору.

Народная песня з'яўляецца асновай народнага харавога мастацтва. Без вывучэння законаў яе гістарычнага развіцця, жанравай спецыфікі, асаблівасцей музычна-паэтычнага зместу немагчыма падрыхтоўка кваліфікаванага спецыяліста - кіраўніка народнага хору.

Усе выдатныя дзеячы народнага харавога мастацтва, такія як Р.Шырма, З.Мажэйка, З.Эвальд, у сваёй працы абапіраліся на вывучэнне беларускай народнай творчасці, разглядаючы яе з розных бакоў пры дапамозе аналізу асаблівасцей народнай песеннай культуры.

Асаблівасці развіцця народна-харавога выканання ў пэўны гістарычны час далі штуршок развіццю аўтарскай кампазітарскай творчасці. Прафесіяналізацыя ў народна-харавым мастацтве выклікала адмаўленне ад выканання аўтэнтычнай беларускай народнай песні. Збядненне рэпертуару, нівеліроўка рэгіянальных песенных традыцый страцілі творчую індывідуальнасць харавых калектываў, згубілі нацыянальную самабытнасць. Зараз вялікая ўвага надаецца рэпертуару народных калектываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская народная песня павінна стаць яго асновай, кожны народны калектыў, абапіраючыся на мясцовыя традыцыі народнай культуры, можа стаць непаўторным.

Такім чынам, асновай народна-харавога выканання павінна стаць паглыбленае вывучэнне традыцый народнага музычнага мастацтва, якое дазваляе пранікнуць у глыбіню народнага музычнага мыслення, не капіруючы яго стылёвыя рысы. Адным з важных метадаў асэнсавання асаблівасцей народнай музычна-харавой творчасці з'яўляецца аналіз яе лепшых ўзораў.

Аўтэнтычная народная песня пачынае займаць галоўнае месца ў рэпертуары народных харавых калектываў. Узрастае цікавасць да фальклору. Пачынаецца папулярызацыя дзіцячых і дарослых фальклорных калектываў. Значная роля ў гэтым належыць выпускнікам нашага універсітэта. З кожным годам павялічваецца колькасць народных хароў і ансамбляў. Расце іх выканальніцкі ўзровень.

Развіццё народнага мастацтва прад'яўляе да спецыяліста самыя сур'ёзныя патрабаванні. Веды будучых спецыялістаў не павінны абмяжоўвацца вывучэннем вузкаспецыяльных дысцыплін. Праца з калектывам патрабуе ад кіраўніка развіцця інтэлекту, эрудыцыі і мастацкага густу. І ў працэсе навучання спецыялістаў павінна ўлічвацца ўся разнапланавасць дзейнасці кіраўніка народнага харавога калектыву.

Поспех працы кіраўніка цалкам залежыць ад разумення ім заканамернасцей развіцця народнай музычнай творчасці, яе гістарычнай і дыялектычнай асноў. Кіраўніку трэба ўмець выкарыстоўваць вынікі комплекснага аналізу народнай песні. Таму развіццё ў студэнтаў аналітычнага мыслення павінна займаць адно з галоўных месц у падрыхтоўцы кіраўніка народна-харавога калектыву. Яно неабходна ў падборы і вывучэнні рэпертуару, яго запісу і расшыфроўцы, аранжыроўцы, а таксама ў сцэнічным увасабленні, ацэнцы выканальніцкага ўзроўню калектыву.

Без аналізу не можа быць глыбокага асваення народнай творчасці, яе рэалізацыі ў выканальніцкай практыцы. Развіццё навыкаў ана-лізу ў будучых-кіраўнікоў павінна здзяйсняцца на працягу ўсіх гадоў навучання.Галоўным аб'ектам у гэтым плане можа стаць народная песня. Яна з'яўляецца сінтэзам музыкі, слова, жэста, мімікі, танца. Таму для сцэнічнага ўвасаблення неабходны веды па музыцы, літаратуры, харэаграфіі, жывапісу. Пры сцэнічным увасабленні народнай песні патрабуецца таксама веданне законаў сцэны і сцэнічнага майстэрства.

Комплексны аналіз фальклорнага твора прадвызначае вывучэнне ўсіх сродкаў музычна-паэтычнай выразнасці паасобку, а таксама ва ўзаемасувязі.

На сённяшні дзень няма дапаможнікаў па аналізе сцэнічнага ўвасаблення народнай песні. Іх распрацоўка з'яўляецца асновай ва ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі кіраўнікоў народных хароў.

Значэнне развіцця навыкаў аналізу народнай песні цяжка перабольшыць. Аналіз дапамагае ўдумліва і творча адносіцца да народнай творчасці, вучыцца цаніць і разумець народную песню. Аналізуючы і даследуючы яе традыцыі, сувязь з сучаснасцю, мы праяўляем клопат аб будучыні беларускай народнапесеннай культуры.

Жылінская Н.П.,
выкладчык

## КАЛЯНДАРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ І ПРАКТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

У працэсе выкладання дырыжорска-харавых дысцыплін песні каляндарна-земляробчага круга з'яўляюцца цікавым вучэбным матэрыялам і займаюць вядучую ролю ў вывучэнні традыцыйнага песеннага фальклору. Гэта старажытны гісторыка-стылёвы пласт. Названыя песні цесна звязаны з той ці іншай парой года і выконваюць пэўную функцыянальную нагрузку. У залежнасці ад пары года яны падзяляюцца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія.

У аснове вызначэння жанру каляндарных песень ляжыць функцыянальная прымета: гэта калядкі, шчадроўкі, гуканне вясны, масленічныя, валачобныя, юр'еўскія, траецкія, жніўныя, русальныя, карагоды, купальскія, дажыначныя,ярныя ("як жнуць ярыцу").

У гадавым крузе народных свят і земляробчых абрадаў, вакол якіх групіраваліся традыцыйныя каляндарныя песні, на першым плане -



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ